# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
10 ВЕРАСНЯ
1992 года
№№ 12—13
(1678—1679)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

## Новыя прызначэнні

**Сяргей Мікітавіч ДАНІЛАЎ** — дырэктар студэнцкага гарадка.

**Сігізмунд Адамавіч МАЛЕВІЧ**, доктар філасофскіх навук, прафесар — загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі філасофска-эканамічнага факультэта.

**Віктар Генадзьевіч ШАДУРСКІ**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт — начальнік упраўлення міжнародных сувязей.

**Аляксандр Віктаравіч ШАРАПА**, доктар гістарычных навук, прафесар — загадчык кафедры міжнародных зносін гістарычнага факультэта.

ЭКСКЛЮЗІЎ

## МАРАФОН: ПЕРАМОЖЦЫ НА ПЕРШЫМ КУРСЕ

***Каму, скажыце, прыйдзецца да спадобы паведамленне аб тым, што па «конкурснай» статыстыцы наш універсітэт у тройку прэстыжных ВНУ рэспублікі не ўвайшоў?***

— Сёлета, як і на працягу апошніх трох-чатырох гадоў, сярэдні конкурс па універсітэту не перавысіў 2,5 чалавек на месца,— паведамляе старшыня прыёмнай камісіі прарэктар **Пётр Іванавіч БРЫГАДЗІН.** У той жа час ён упэўнены, што перавага за больш важкімі, якаснымі падлікамі. І тут роўных універсітэту няма — 1318 чалавек з паступаючых 3250 мелі залатыя медалі ці «чырвоныя» дыпломы ПТВ і тэхнікумаў, а план набору ва універсітэт, між іншым, 1775 чалавек.

**— І ўсё ж, якія з факультэтаў не карысталіся асаблівай папулярнасцю?**

— Як і ў мінулым годзе — прыродазнаўчыя: фізічны, радыёфізікі і электронікі, ФПМІ і межмат.

**— А сапраўднае паломніцтва абітурыентаў назіралася...**

— ...безумоўна, на юрыдычным, дзе да пісьмовага экзамена па матэматыцы канкурэнцыя была самай жорсткай: за адной месца змагаліся шэсць чалавек.

**— Звычайна, маецца на ўвазе, што нечаканасці падпільноўваюць па ўступных экзаменах толькі паступаючых. Але ж і члены прыёмнай камісіі ад гэтага не застрахаваныя.**

— Самы вялікі сюрпрыз — рэзкае павелічэнне колькасці жадаючых паступіць на некаторыя спецыяльнасці, якія ў мінулым годзе абітурыенты абдзялілі ўвагай. Гэта беларускія аддзяленні педагагічных патокаў прыродазнаўчых факультэтаў. Мы адважыліся на эксперымент і на гэтыя спецыяльнасці прымалі медалістаў без уступных экзаменаў, па выніках субяседвання. Высокі конкурс прымусіў нават павялічыць план прыёму. Напрыклад, запланаваўшы прыём на беларускае аддзяленне педагагічнага патока хімфака 20 чалавек, у выніку прынялі 40; на такое ж аддзяленне мехмата — замест 30 — 52.

Прыемна ўразіла якасць падрыхтоўкі па беларускай мове сярод тых, хто паступаў на прыродазнаўчыя факультэты. А многія ж ВНУ, якія, згодна з «Законам аб мовах», планавалі прымаць профільныя экзамены па беларускай мове і літаратуры, у апошні момант замянілі іх на залікі. Першапачаткова мы, безумоўна, рызыкавалі, але даказалі сабе і іншым, што праблема здачы ўступных экзаменаў на беларускай мове ў многім надуманая, рэчаіснасць усеагульнай боязі не пацвердзіла.

НАВІНЫ З ПРАФКОМА

## ПАД ДАХАМ ЖЫВЁМ З РАЗМАХАМ

**Наша жыццё стала горшым? Калі пазбегнуць катэгарычна-адназначнага адказу і заўважыць, што гэта яшчэ з якога боку паглядзець... дык адразу і станоўчыя прыклады знойдуцца. Вось гэты хаця б: упершыню ў нашым універсітэце прынята рашэнне ў пачатку навучальнага года забяспечыць усіх першакурснікаў, якія маюць у гэтым патрэбу, месцамі ў інтэрнаце.**

Пакуль невядома, колькі студэнтаў старэйшых курсаў вымушаны будуць пайсці на кватэры. Магчыма, усе жадаючыя атрымаюць месцы ў інтэрнаце — такую надзею ў студэнцкім прафкоме універсітэта не губляюць. Адна з падстаў для яе — тое, што з намі падзеляцца інтэрнацкімі пакоямі іншыя навучальныя ўстановы, перагаворы наконт гэтага вядуцца.

Для тых жа студэнтаў БДУ, каму ўсё ж такі давядзецца шукаць месца на кватэры, плануецца выплочваць кампенсацыю памерам 25 працэнтаў ад мінімальнай зарплаты ў рэспубліцы. Гэта таксама пакуль толькі праект, але верагодны.

Яшчэ адна навіна новага навучальнага года: розныя інтэрнаты цяпер будуць каштаваць па-рознаму, у залежнасці ад ступені іх добраўпарадкаванасці. Дэталі гэтага новаўвядзення пакуль абмяркоўваюцца.

Але ўжо сёння можна упэўнена сцвярджаць: студэнты БДУ без даху над галавой не застануцца.

СУМНЫ РЭПАРТАЖ

## А ЦІ БЫЛО СВЯТА?







***Раніцай 1 верасня дыктары Беларускага радыё запрашалі студэнтаў і выпускнікоў БДУ на свята, якое павінна было адбыцца а 16 гадзіне ва універсітэцкім дворыку.***

***Аб тым жа паведамлялі аб'явы ў самім універсітэце.***

А 16 гадзіне ля прыступак галоўнага корпуса сабралася некалькі дзесяткаў студэнтаў, у большасці першакурснікаў. Сабраліся яны невялічкімі групкамі і паасобку, так і правялі агульнае свята. Са словамі да іх звярталіся рэктар, загадчык вучэбна-метадычным упраўленнем, студэнт-пяцікурснік, аспірантка. І паралельна з гэтымі словамі ў групках вяліся размовы пра адрасы летняга адпачынку, камерцыйныя поспехі і абноўкі ў адзенні. Зразумела, людзі ля мікрафона гаварылі аб іншых праблемах...

У рэшце рэшт дзіўнае атрымалася святкаванне, падобнае ці то на вымушаную ўсмешку перад фотааб'ектывам, ці то проста на пародыю. Можа, сёлетнія першакурснікі і не чакалі ад яго іншага, бо прызвычаіліся ўжо да знікнення святаў з нашага жыцця. А вось тым, хто мае магчымасць для параўнання, было аб чым пасумаваць.

У недалёкім мінулым пачатак навучальнага года заўсёды станавіўся сапраўдным святам ва універсітэце. Яго дворык напаўняўся студэнтамі. І зусім іншыя былі ў іх твары, і непараўнальна весялейшы настрой. Няўжо толькі таму, што тады ніжэйшай была плата за пражыванне ў інтэрнаце і таннейшымі абеды ў сталоўцы? (Стыпендыі ж таксама меншымі былі!) Пэўна, больш значныя з'явы непазнавальна змянілі студэнцкае асяроддзе. На жаль, немагчыма пакуль скласці дакладны іх пералік. Мы паспелі ўсвядоміць, што набылі дзякуючы шматлікім зменам навокал, а падлічваць страты чамусьці не спяшаемся.

Дзякуй вам, адміністрацыя ўніверсітэта, за клопаты і пажаданні. І... прабачце!

**Фота С. ВАСІЛЬЕВА.**

СТУДЭНТ І РЫНАК

## ПАКУЛЬ ПАДРУЧНІК АДЗІН НА ТРАІХ

**Па словах Ірыны Уладзіміраўны АРЭХОЎСКАЙ, дырэктара фундаментальнай бібліятэкі БДУ, кошт кнігі павялічыўся ў сярэднім у 80 разоў.**

**— Сярод навучальных устаноў бібліятэчны фонд БДУ лічыцца адным з багацейшых у нашай рэспубліцы. Ці не адбудзецца ў сувязі з падаражаннем кніг рэзкае яго збядненне?**

— Становішча, мякка кажучы, неспрыяльнае. Але мы імкнемся набываць усё найбольш значнае, што выходзіць у апошні час у кнігавыдавецтвах не толькі нашай рэспублікі, але і былога Саюза. Як заўсёды, выпісваем вялікую колькасць перыёдыкі. Рэктарат разумее нашы праблемы, не адмаўляе ў адпаведных сумах. Аднак набываць падручнікі ў ранейшай колькасці сёння для нас ужо раскоша.

**— Значыць, «голад» на падручнікі — такое ж відавочнае бедства, як і пустыя паліцы магазінаў?**

— Пакуль (на бягучы год) пагрозы няма. Захаваецца норма: адзін падручнік на тры чалавекі. Чаго нельга гарантаваць у недалёкай будучыні. Мы шукаем выйсце. Вымушаны, напрыклад, значную частку сродкаў накіроўваць на ўкамплектаванне чытальнай залы, каб усе мелі аднолькавую магчымасць карыстацца патрэбнай літаратурай. Але і тут узнікаюць праблемы — зала будзе заўсёды перапоўненай, спатрэбяцца дадатковыя памяшканні.

Трэба ўлічваць і неабходнасць захавання фондаў. Таму кожную кнігу будзе цяпер выдаваць бібліятэкар.

**— А што, існуе рэальная пагроза раскрадання бібліятэкі студэнтамі?..**

— Даўжнікоў у нас шмат... Калі раней студэнт разлічваўся з бібліятэкай толькі пасля заканчэння універсітэта, то зараз гэта робіцца кожны год. Чытач павінен памятаць пра свой абавязак — як мага хутчэй вярнуць кнігу, у якой ён ужо не мае патрэбы Як і раней, за згубленую кнігу студнт павінен заплаціць у дзесяць разоў даражэй яе цаны,аля цана будзе вызначацца памерам рыначнага кошту.

**— Так, мажліва, кнігі даўжнікоў вернуцца. Але ці спатрэбяцца яны сённяшняму «беларусізаванаму» студэнту?**

— Усё, што выдавалася раней на беларускай мове, бібліятэка мае. Іншая справа — вядомыя складанасці ў кнігавыдавецтвах: яны не выконваюць заказы. Выкладчыкі па спецыяльных дысцыплінах самі распрацоўваюць курсы лекцый на роднай мове. Дарэчы, адпаведнай метадычнай літаратуры таксама няшмат. Таму заказ нам патрэбна набыць болей слоўнікаў руска-беларускіх і беларуска-рускіх.

Гутарыла Т. КАЗАК.

АПОШНЯЯ ДЗЕЯ

## Калгаснікі на час

***Дзве з паловай тысячы студэнтаў Белдзяржуніверсітэта былі запатрабаваны мясцовымі ўладамі для дапамогі калгасам і саўгасам па ўборцы бульбы.***

Прарэктар па вучэбнай рабоце **Пётр Дзмітрыевіч КУХАРЧЫК** паспрабаваў шляхам аргументаваных спрэчак з прадстаўнікамі Мінскага аблвыканкома скасаваць гэтую лічбу амаль удвая і меў рацыю. На справе высветлілася, што кіраўнікі сельскагаспадарчых аддзелаў райвыканкомаў па традыцыі лічбы завысілі, а гаспадаркі, падлічыўшы людскія і грашовыя рэсурсы, ад студэнцкай працоўнай сілы ў большасці выпадкаў адмаўляюцца. Скажам, у Клецкім раёне з запрошаных 400 чалавек згадзіліся працаўладкаваць на месяц толькі 37.

Такім чынам, гістарычны і хімічны факультэты пачалі вучэбны год у 100-працэнтным саставе, другакурснікі журфака перададзены ў распараджэнне прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце, а другакурснікі астатніх факультэтаў працуюць на палетках да 26 верасня ўключна і з 1 кастрычніка пачнуць вучобу ў сценах альма-матэр.

Па ўсім відаць, сёлетняя бульбяная кампанія — апошні акорд у сельскагаспадарчай эпапеі, калі студэнт быў падняволеным ў цэлай дзяржавы. З надыходам рынка, трэба спадзявацца, ажыццявіцца, нарэшце, прынцып: калгасніку — калгаснікава, студэнту — студэнтава.

Зрэшты, ад гэтага выйграюць і першыя, і другія, і дзяржава ў цэлым.

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

# МІНІСТЭРСТВА ЎПАЎНАВАЖАНА АДКАЗАЦЬ...

***На беларускім тэлебачанні нядаўна адбылася «прамая лінія» з прадстаўнікамі Міністэрства народнай адукацыі — міністрам Віктарам Гайсёнкам, намеснікамі яго — Георгіем Бутрымам, Анатолем Горнакам, начальнікам упраўлення ВНУ і педагагічнай адукацыі Мікалаем Плескацэвічам, начальнікам упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Генадзем Пятроўскім, а таксама начальнікам упраўлення дашкольнага выхавання Тамарай Карасцянёвай і галоўным спецыялістам планава-эканамічнага ўпраўлення Ліліяй Анцінай.***

**— Ці мяркуецца памяншэнне колькасці прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы? І як плануюць развіваць платныя ВНУ?**

М. ПЛЕСКАЦЭВІЧ: — Калі разважаць пра колькасць навучэнцаў, тут трэба ўлічваць запатрабаванні рэспублікі ў кадрах: напрыклад, у педагагічных інстытутах працэс адваротны, нават ёсць тэндэнцыя крыху да павелічэння, бо пытанне аб педагагічных кадрах у рэспубліцы стаіць яшчэ востра. Што датычыцца тэхнічных ВНУ, то невялікае памяншэнне назіраецца сёлета. Тэндэнцыя ж: прымаць столькі, колькі для рэспублікі спецыялістаў патрэбна. Гэты год прысвечаны далейшаму пошуку рашэнняў гэтых пытанняў. Тут павінны з'яднаць намаганні Дзяржплан з Міністэрствам адукацыі. Што датычыцца платных ВНУ,яны растуць вельмі хутка. У Мінску, здаецца, іх ужо пяць. Падкрэслім: трэба ўсталяваць дзяржаўныя запатрабаванні да зместу адукацыі. Сёння ў нас на працоўнай планёрцы дадзены ўказанні ўсім упраўленням, не з'яўляецца выключэннем і вышэйшая школа. Мне здаецца, што і платныя навучальныя ўстановы павінны былі б на першым этапе 1-ы семестр вучыць задарма, каб паказаць, ці будзе ў такіх установах патрэбны ўзровень, бо інакш можа атрымацца, што ад жадання атрымаць грошы страціць якасць навучання.

**— Тыя студэнты, што пачалі вучобу ў іншых рэспубліках, змогуць давучыцца там?**

М. ПЛЕСКАЦЭВІЧ: — Гэта пытанне вырашалася па ўзгадненню з іншымі рэспублікамі. Але ёсць факт, які даў вялікі рэзананс: гэта завяршэнне навучання спецыялістаў грамадзянскай авіяцыі, у прыватнасці, у Рыжскім авіяцыйным універсітэце. Вырашылі: студэнтаў 2-га, 3-га курса перавесці ў рэспубліку па адэкватнаму профілю, а студэнты старэйшых курсаў завершаць сваё навучанне там. Перавучваць іх ці пачынаць спачатку нятанна. Таму мы павінны зараз вырашыць гэта пытанне, каб не хваляваліся ні навучэнцы, ні іх бацькі.

**— Надышоў час змяніць падыход да ваеннай падрыхтоўкі ў школе.**

Г. Бутрым: — Дык вось яе будзем называць не столькі дапрызыўнай, а спецыяльнай падрыхтоўкай для юнакоў. Ставіцца задача падрыхтаваць псіхічна юнакоў для службы ў нашым войску. Але ж я не буду больш падрабязна гаварыць аб гэтым, таму што давайце дачакаемся зараз закону аб вайсковым абавязку, які будзе прыняты на восеньскай сесіі. Хачу сказаць, што пасля доўгага вывучэння прызнана мэтазгодным ўнесці і значныя карэктывы наконт змены ваенрука. Зараз прызнана мэтазгодным плаціць ваеннаму кіраўніку за 18 гадзін, як усім настаўнікам.

Тут яшчэ пытанне аб лёсе ваенных кафедраў у БДУ, у прыватнасці. У гэтым годзе змен пакуль не прадбачыцца. Але іх лёс залежыць ад Закона і Міністэрства абароны.

**— З якога года будуць уведзены ступені бакалаўра і магістра?**

М. ПЛЕСКАЦЭВІЧ: — Гэта пытанне разгледжана на спецыяльным пасяджэнні міністэрства. Справа за канкрэтным вырашэннем. Што тут трэба ўлічваць? Вызначаецца некаторая паспешлівасць і неадпрацаванасць методыкі, мы атрымаем не тое, што хацелася б. А ўлічваць трэба, што ступені бакалаўра і магістра закліканы змяніць вышэйшую адукацыю, але ўсё гэта падпарадкоўваецца інтарэсам асобы, бо той, хто сеў учора першакурснікам, праз пяць гадоў будзе выпускніком. А гэта канец стагоддзя, і ім жыць і працаваць у новым стагоддзі. Выпускнікі вышэйшай адукацыі гэта тыя, каго чакае прамысловасць, сельская гаспадарка, арганізацыя аховы здароўя, культура, адукацыя. І таму наша прысваенне ступені бакалаўра ці магістра павінна адпавядаць працы ў новых умовах.

Адказы на пытанні да друку падрыхтаваў Аляксандр КОКТЫШ

ЯК ВЫЖЫЦЬ?

# ЗА БРЫЛЬЯНТАВЫМ МОРАМ І ЗАЛАТЫМ СОНЕЙКАМ

І сапраўды, імчаліся мы на поўдзень у млосным цягніку не за вялікімі грашыма. Асацыяцыі ў большасці з нас вядомыя: поўнач — «Калыма», поўдзень — адпачынак. Але ў звычайнага студэнта не заўсёды хопіць грошай, каб адпачыць па-сапраўднаму, ды яшчэ на паўднёвым беразе Крымскага паўвострава.

І склаўшы ўсяго толькі па дзве цяперашнія стыпендыі, студэнты стварылі атрад. Прываблівала нас і прыемна зацікавіла яшчэ паведамленне, што працаваць будзем на арандатара — сапраўднага гаспадара.

Ён, Анатоль Бернадзін, прымае да сябе на працу студэнтаў у тры змены: ліпень, жнівень, верасень. Дарэчы, дагавор паміж пачынаючым фермерам і хімічным факультэтам нашага універсітэта працягнуты яшчэ на пяць гадоў.

Асноўная работа — падвязка вінаграда. Шэсць гадзін у дзень — з 6 ранку да 12, за трыццаць рублёў на брата з улікам выканання нормы. Норма ж, па ўсім відаць, з кожным днём усё ўзнімалася.

Працы на зямлі для нас хапіла: кожны дзень усплывалі ўсё новыя і новыя заданні: быў пераполаты перац, частка памідораў. А харчаваліся, дарэчы, за свае грошы. Адно добра — гаспадар кожны працоўны дзень дастаўляў абед. У мэтах эканоміі прыходзілася задавальняцца бедным асартыментам. Снеданне і вячэру гатавалі самі.

А далей — яшчэ горш, пачалі палоць гвадзікі. І калі вам выпадкова пашчаеціць прыпаднесці гэтыя сапраўды прыгожыя кветкі каму-небудзь з нас, не здзіўляйцеся, калі ласка, нечаканай рэакцыі. Адолелі і кветкі. Засталося некалькі дзён да канца змены, а гаспадар прызапасіў для нас яшчэ адну дзялянку памідораў. І тут рухнула не толькі цярпенне, але і надзея. Збеглі студэнты ад арэндатара ў Алушту, атрымаўшы за сваю працу капейкі. Збеглі не ад цяжкай працы — ад нечаканых адносін да сябе. Па падліках высветлілася, што за 30 рублёў не набыць і двух боханаў хлеба. А яшчэ жартавалі: «Трэба два дні працаваць, каб адзін раз сфатаграфавацца з малпай» (была такая цікавая прапанова ў мясцовых бізнесменаў).

І наогул, здавалася, што сонца і мора — скарб нашага гаспадара. А мажліва, яно і так, калі ўлічыць, што Анатоль быў партыйны сакратар Алушчінскага гаркома.

А ўрэшце, ці толькі ён карыстаўся нашым няведаннем падводных рыфаў рыначнай эканомікі? Нават месца на пляжы каштавала то 5, то 15 рублёў. А мы думаем, што паўднёваму сонейку ўсё роўна, каму свяціць, і мора таксама на ўсіх адно. Гэта людзі зрабілі мора брыльянтавым, а сонейка залатым.

Т. КАЗАК.

ВЫБІРАЙЦЕ САМІ

# ПРЫГАЖОСЦЬ І ДЛЯ ВАС

**Дарагі першакурснік! Зразумела, ты сам ведаеш, навошта табе вучоба ва універсітэце: проста для атрымання дыплома, для навуковай ці іншай кар'еры ці для баўлення часу ў цікавым асяроддзі. Пяць гадоў, якія ў цябе наперадзе, абавязкова будуць сярод самых цікавых у жыцці. Асабліва ў тым выпадку, калі ты аддасі іх не толькі вучобе.**

**Калі хочаш паслухаць аўтарытэтнае меркаванне на гэты конт — спытай каго-небудзь з удзельнікаў студэнцкіх мастацкіх самадзейных калектываў універсітэта. Яны — прадстаўнікі асаблівай часткі студэнцтва БДУ. А табе не хацелася б мець да яе прамое дачыненне? Калі ласка — выбар за табой!**

**НАРОДНЫ ФАЛЬКЛОРНА-ЭТНАГРАФІЧНЫ АНСАБЛЬ «НЕРУШ» — з самых знакамітых мастацкіх калектываў нашага універсітэта. Але няхай магчымых навічкоў гэта не пужае. Калі вас хвалюе беларуская песня, цікавяць старажытныя народныя абрады і звычаі, калі вы марыце шчыльна дакрануцца да сапраўднай народнай творчасці і маеце музычныя здольнасці — «Неруш» для вас. Паспрабуйце! Рэпетыцыі калектыву праходзяць па аўторках і чацвяргах а 18 гадзіне ў актавай зале галоўнага корпуса. Мастацкі кіраўніо — Валянціна ГЛАДКАЯ.**

Дарэчы, з кастрычніка пры «Нерушы» будзе працаваць дзіцячая фальклорная студыя.

Яшчэ адзін знакаміты калектыў — НАРОДНЫ АНСАМБЛЬ ТАНЦА «КРЫЖАЧОК», які існуе ва універсітэце з 1945 года. Яго ўдзельнікі збіраюцца на рэпетыцыі па панядзелках, серадах і чацвяргах у спартыўнай зале галоўнага корпуса ў 19.30. Калі вы маеце пэўную харэаграфічную падрыхтоўку і жаданне выконваць танцы розных народаў свету на высокім прафесійным узроўні — прыходзьце. Акрамя ўсяго, пачуеце шмат цікавага пра апошнюю замежную паездку калектыву — у Італію. Адміністратар «Крыжачка» — **Наталля ЯНУШКЕВІЧ.**

**АКАДЭМІЧНЫ ХОР СТУДЭНТАЎ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА цяпер на гастролях у Германіі і Даніі. Але хутка вернецца і адновіць свае рэпетыцыі ў 607 аўдыторыі галоўнага корпуса, па аўторках і чацвяргах, у 19.30. Хор існуе з 1947 года і за гэты час стаў самабытнейшым калектывам з багатымі традыцыямі і разнастайным рэпертуарам — ад старажытнай беларускай, рускай і заходняй музыкі, музыкі сярэднявечча і XIX стагоддзя да песень «Бітлз». Мастацкі кіраўнік і дырыжор хора — Маргарыта ЛАПКОЎСКАЯ.**

**Калі вы добра ведаеце, як трымаць у руках домру, балалайку, баян, акардэон, як здабываць прыгожыя гукі цымбал і іншых інструментаў — вы можаце знайсці прыемны і цікавы прытулак свайму вольнаму часу ва універсітэцкім НАРОДНЫМ АРКЕСТРЫ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ пад кіраўніцтвам Алега ШАПЯЛЕВІЧА.**

# ЁСЦЬ ЭНТУЗІЯЗМ!

***Не так даўно замест былой камсамольскай структуры быў створаны каардынацыйны маладзёжны цэнтр. А паколькі ён — дзіця не надта клапатлівых бацькоў, нічога яму і не засталося, акрамя ініцыятывы. Таму і называецца ён цэнтрам маладзёжных ініцыятыў.***

Нагадаем: старшыня цэнтра — **Аляксей БАГДАНОВІЧ**, намеснік старшыні, а таксама каардынатар маладзёжных міжнародных праграм — **Іван РАК**. Усе астатнія, хто працуе ў цэнтры ці нейкім чынам яму дапамагае,— проста ініцыятыўныя студэнты. Як бачым, ярка акрэсленай, строгай структуры і іерархіі цэнтр не мае.

Цэнтр трымаецца выключна на энтузіязме студэнтаў і гатовы выконваць любую грамадскую працу на карысць універсітэта. Гэта арганізацыя і правядзенне злётаў, канферэнцый, спаборніцтваў, фестываляў моладзі, урачыстых святкаванняў, дыскатэк і ўсяго таго, чым раней займаўся камсамол, але без былога ідэалагізаванага падыходу амаль да кожнай справы.

Сваёй матэрыяльнай базы, акрамя пакоя з тэлефонам, цэнтр не мае. Грошы зарабляюць самі. Сумесна са службамі занятасці моладзі арганізуюць атрады для працы ў піянерлагерах, калгасах рэспублікі. Займаюцца рэалізацыяй міжнародных праграм. Плануюць у перспектыве стварыць на базе універсітэта міжнародны маладзёжны цэнтр, якіх шмат у іншых краінах свету і з якімі БДУ падтрымлівае цесныя ўзаемаадносіны.

**Калі ў вас ёсць ідэі наконт таго, як зарабляць грошы і добра адпачываць, звяртайцеся ў 306 пакой галоўнага корпуса. Тэлефон 20-66-85.**

А Ў НАШЫХ СУСЕДЗЯЎ!

# ПРЫСЯГАЮ ТАБЕ, БЕЛАРУСЬ!



480 курсантаў-першакурснікаў Мінскага вышэйшага ваеннага інжынернага і Мінскага вышэйшага ваеннага каманднага вучылішчаў прынялі днямі прысягу на вернасць Беларусі і яе народу. Урачыстая падзея адбылася на сталічнай плошчы Незалежнасці. Курсантаў віталі міністр абароны Рэспублікі Беларусь П. Казлоўскі, намеснік старшыні Вярхоўнага Савета В. Кузняцоў.

Сённяшнія першакурснікі — гэта афіцэры арміі незалежнай Беларусі заўтра. Ад іх спатрэбіцца шмат сіл, ведаў, патрыятызму пад час служэння роднай Айчыне.

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.







БЫТ ЦІ НЕ БЫТ?

# ЖЫЦЦЁ — ЧАРГА

**Няма ў пачатку навучальнага года ў іншагародніх студэнтаў больш важнага пытання, чым сакраментальнае — дзе жыць?**

**З атрыманнем ордэра на права пражывання ў інтэрнаце сапраўдныя клопаты студэнта аб месцы жыхарства толькі пачынаюцца. Добра, калі ёсць дзе спыніцца самае меншае на два дні, бо прыкладна за гэты час можна атрымаць ключы ад запаветнай мары — пакойчыка на чацвярых. Але спачатку, так ужо прынята ў нашым неўладкаваным грамадстве, — ЧАРГА.**

**...за медыцынскай даведкай, адным з галоўных дакументаў пры засяленні.**

**І гэта найпрыемнейшы момант для медыцынскіх работнікаў — цяпер студэнт трапіў да іх у рукі і не вырвецца, пакуль не пройдзе флюараграфію, якой паспяваў пазбягаць цэлы год.**

**Пачынаючы з 27 жніўня, у двары галоўнага корпуса БДУ з нарастаючай сілай і пікам 31 жніўня адбываўся сапраўдны штурм знаёмай машыны з будкай. У першыя вераснёўскія дні чарга не паменшала, але выглядала больш цывілізаванай.**

**Студэнты БДУ праходзілі флюараграфію разам са студэнтамі БТІ, пед- і мед-інстытута. Усе астатнія ездзілі ў вядомую студэнцкую паліклініку, дзе таксама былі ўведзены ў дзеянне дадатковыя рэзервы. Даеш флюараграфізацыю ўсяго студэнцтва!**

**За каментарыем мы звярнуліся да Нэлы Ільінічны ГАРУЛЕВАЙ, загадчыцы трэцім тэрапеўтычным аддзяленнем 33-й паліклінікі.**

**— У сувязі з нестабільным становішчам (ёсць шмат выпадкаў захворвання) флюараграфію неабходна праходзіць усім. Студэнты ж, якія жывуць у інтэрнаце, акрамя ўсяго, больш рызыкуюць падхапіць якую-небудзь інфекцыйную хваробу.**

**Толькі за апошнія дні, дарэчы, ужо вылучаны два студэнты, якія, магчыма, яшчэ не захварэлі на туберкулёз, але на ўсялякі выпадак пройдуць дадатковае абследаванне ўжо ў тубдыспансеры.**



**...у бухгалтэрыю.**

**Назіраліся і тут складанасці, а чэргаў велізарных не было, як заўсёды, калі праца добра наладжана. Праўда, для некаторых студэнтаў аказалася нечаканасцю патрабаванне плаціць альбо толькі савецкімі рублямі, альбо толькі беларускімі разліковымі знакамі. У бухгалтэрыі гэта растлумачылі складанасцю, якая ўзнікае ў далейшым у справаздачах, і тым, што пры такім падыходзе даводзіцца выпісваць дзве квітанцыі аб аплаце. А гэта, як вы самі эдагадаліся, самым непасрэдным чынам паўплывала б на ўзнікненне чаргі. Што ж вам больш да спадобы?**

**...у інтэрнаце.**

**Самая апошняя. Тут ужо стаяць цярпліва і з палёгкай. І колькў ты тут прастаіш, залежыць ад каменданта, прафбюро факультэта і, канешне, ад твайго стажу пражывання ў інтэрнаце. Як каму шанцуе.**

**Для нядбайных і гультаяватых існавала і яшчэ адна непрыемная чарга — у фотаатэлье, каб зрабіць фотаздымкі 3×4 тэрмінова ´Але «ківаць» тут няма на каго — самі б загадзя паспяшылі, не мелі б клопату дадатковага пад час і без таго даволі гарачых дзянькоў.**

У чэргах стаяла
Т. КАЗАК.

САКРЭТ ФІРМЫ

## ДЗЯКУЙ, НЕ ТРЭБА!

Дзесяць платных месцаў у ВНУ Масквы і Санкт-Пецярбурга было выдзелена ў гэтым годзе рускамоўным студэнтам з Эстоніі. Аднак урад балтыйскай дзяржавы падзякаваў і адмовіўся, бо палічыў грашовую плату за ласку былога сваяка празмернай. І, здаецца, меў рацыю: патрабаванне 100 тысяч рублёў у год за кожнага студэнта — хіба ж гэта па-сваяцку?

**ПАСТСКРЫПТУМ. Тым часам сенат ЗША прыняў рашэнне аб выдзяленні бязвыплатнай дапамогі Расіі, у межах якой прадугледжваецца выдзяленне 100 мільёнаў долараў ЗША на развіццё адукацыі. Біль, падрыхтаваны сумесна з супрацоўнікамі Міністэрства адукацыі, прадастаўлены на разгляд Ніжняй палаты кангрэса.**

## А ТЫ ЗАСТРАХАВАЎСЯ?

***Падарванае напружанай вучобай здароўе студэнты МДТВ імя Баумана ў хуткім часе змогуць паправіць з дапамогай студэнцкай медыцынскай страхавой кампаніі. Створаная студэнцкім прафкомам кампанія ў ролі пасрэдніка паміж студэнтамі і эскулапамі зможа абараніць першых ва ўмовах узрастаючай дарагоўлі медыцынскага абслугоўвання і пракантраляваць якасць лячэння.***

## БАГАМАЗ У ЗАКОНЕ

***Львоўскі інстытут прыкладного і дэкаратыўнага мастацтва з гэтага года пачынае падрыхтоўку спецыялістаў па праектаванню і афармленню храмаў. Сарыентаваліся якраз у час — на Украіне адраджаюцца, адкрываюцца зноў сотні храмаў, а рэдкія спецыялісты па іх аднаўленню нарасхват.***

## ЯК ГРЫБЫ ПАСЛЯ ДАЖДЖУ

***Вокаімгненна ўзрастае ў Расеі колькасць недзяржаўных навучальных устаноў. За апошні год назіраецца наступны «прырост»: 31 недзяржаўная навучальная ўстанова ў Маскве, 9 — у Санкт-Пецярбургу, 8 — у Екацерынбургу, 7 — у Маскоўскай вобласці, 7 — у Валгаградскай вобласці.***

ЛЮСТЭРКА

# МЕНШАСЦЬ, ЯКАЯ ЭКСПЛУАТУЕЦЦА БОЛЬШ ЗА ЎСЁ

**ДА ВАШАЙ УВАГІ — АРТЫКУЛ, НАДРУКАВАНЫ Ў ГАЗЕЦЕ «ПОИСК». ПРАБЛЕМЫ, УЗНЯТЫЯ ІМ, УЖО ШМАТРАЗОВА АБМЯРКОЎВАЛІСЯ НА РОЗНЫМ УЗРОЎНІ, АЛЕ АД ГЭТАГА НЕ ЗГУБІЛІ СВАЕЙ ВАЙСТРЫНІ. ВЫНІК «УЦЕЧКІ МАЗГОЎ» ВЫГЛЯДАЮЦЬ КАТАСТРАФІЧНЫМІ ДЛЯ НАШАГА НАВУКОВАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ.**

**МАГЧЫМА, АРТЫКУЛ ГЕНАДЗЯ НЕСВЯТАЙЛАВА ПАЗНАЁМІЦЬ ВАС З НОВЫМІ ФАКТАМІ, ДАПАМОЖА ЎБАЧЫЦЬ НОВЫЯ АСПЕКТЫ ДАЎНО ВЯДОМАЙ ПРАБЛЕМЫ І ДАСЦЬ НЕЧАКАНЫЯ ПАДСТАВЫ ДЛЯ РОЗДУМУ.**

А ўсё ж такі меў рацыю вядомы заходні сацыёлаг Дж. Марэна, калі пісаў у кнізе «Соцыёметрыя»: «Стваральнікі ідэй... з'яўляюцца меншасцю, якая эксплуатуецца найбольш у свеце. Яны параўнальна нешматлікія, не ўтвараюць класа... Авангард акадэмічнай і сацыяльнай навукі не валодаў сацыяльнымі інструментамі наступлення і контрнаступлення, калі ў гэтым была крайняя неабходнасць».

У нас у Беларусі гэта праблема абрасла сучаснымі дэталямі: мінімальнае прадстаўніцтва людзей навукі ў парламенце, звышэканомія бюджэтных сродкаў, нізкая зарплата. Маладое пакаленне выбірае бізнес, і навука застаецца без прытоку «свежай крыві». Эміграцыя вучоных становіцца формай эканамічнага ўцёку.

Як ставіцца да гэтага? Міжнародная навуковая суполка ад «уцечкі мазгоў» з краін былога СССР выйграе. Выйграюць і самі вучоныя. Краіны СНД спачатку прайграюць, але ў іх наперадзе маячыць будучы выйгрыш. У найбольш пройгрышнай сітуацыі застаюцца інстытуты. Зразумела, што і ацэнка «уцечкі мазгоў» як з'явы залежыць ад таго, з якога пункту гледжання на яе глядзець.

Сярод крайніх пунктаў гледжання вылучаецца такі: масавым выездам вучоных за мяжу трэба ганарыцца. Гэта, быццам, доказ нашага высокага навуковага ўзроўню. Напрыклад, з СССР паехалі каля 80 працэнтаў актыўна працуючых матэматыкаў. Значыць, з матэматыкай у нас усё о'кей. Атрымліваецца, што настаў час замест балаў сацспаборніцтва тэрмінова ўводзіць паказчык «колькасці тых, хто паехаў за мяжу, у тым ліку назаўсёды» і ацэньваць па яму навуковы ўзровень інстытутаў.

Інтэлектуальная міграцыя як сацыяльная з'ява вывучана сацыёлагамі пакуль слаба. Па дадзеных Інстытута гісторыі прыродазнаўства і тэхнікі РАН, хочуць паехаць і цвёрда маюць намер гэта зрабіць да 80 працэнтаў апытаных у акадэмічных інстытутах. Дадзеныя Інстытута сацыялогіі Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь іншыя: не маюць намеру эмігрыраваць 60 працэнтаў матэматыкаў, 50 працэнтаў фізікаў, 40 працэнтаў спецыялістаў па інфарматыцы. Гэта паведамленне на канферэнцыі Акадэміі навук выклікала ў апанентаў пярэчанні: маўляў, лічбы не правільныя, бо ў гэтых інстытутах усе, хто мог, ужо паехалі.

Па дадзеных М. Урнова (УЦІГМ), эміграцыйны настрой сярод навуковых работнікаў Масквы ў гэтым годзе распаўсюджаны слаба. «Чамаданны настрой» толькі ў шасці працэнтаў у абаронным і дваццаці ў грамадзянскім сектары. Матывы ад'езду звычайныя, паўплываць на якія, па меркаванню сацыёлагаў, нерэальна.

Зусім інакш выглядаюць адказы на пытанне аб жаданні паехаць працаваць па кантракту на пэўны тэрмін. Такі намер аказаўся ў паловы апытаных. Прычым адносіны да ад'езду залежаць і ад узросту: патэнцыяльных эмігрантаў больш за ўсё сярод моладзі да 30 гадоў, а жадаючых «паехаць на час» — сярод вучоных ад 30 да 39 гадоў.

Грамадства да «уцечкі мазгоў» ставіцца неаднадначна. Усесаюзнае апытанне грамадскага меркавання ў лістападзе 1991 года было праведзена УЦІГМам па рэпрэзентатыўнай выбарцы гарадскога і сельскага насельніцтва ў дзесяці рэспубліках, у тым ліку ў Беларусі. Большасць адмоўна ставіцца да вучоных-эмігрантаў. Прычым людзі старэйшыя і чым ніжэй узровень іх адукацыі, тым больш нецярпімыя яны да выезду спецыялістаў за мяжу. Разам з тым насельніцтва аднaзначна адмаўляе забараняльныя меры барацьбы з «уцечкай мазгоў». Толькі 28 працэнтаў апытаных у Расіі далі «недэмакратычныя» адказы. Большасць жа выказаліся за тое, каб «павысіць зарплату вучоным і спецыялістам і стварыць для іх такія ўмовы працы і жыцця, каб ім не хацелася пакідаць краіну». Расійскія сацыёлагі робяць вывад, што нават ва ўмовах сур'ёзных эканамічных цяжкасцей грамадства гатова прынесці пэўныя ахвяры, каб спыніць інтэлектуальную эміграцыю.

Цікава, што адносіны людзей да праблемы «ўцечкі мазгоў» звязаны з нацыянальнасцю. Гэта пацвярджаецца пры супастаўленні адказаў, напрыклад, літоўцаў і беларусаў. Літоўцы значна больш цярпімыя да вучоных-эмігрантаў, а 73 працэнты беларусаў за забараняльныя метады. Украінцы яшчэ больш ганьбуюць інтэлектуальныя ўцёкі, але лічаць, што змагацца з імі трэба дэмакратычнымі метадамі.

Як вядома, усё дрэннае прыходзіць само, а ўсё добрае трэба арганізоўваць. Агульнай асаблівасцю праблемы «ўцечкі мазгоў» ва ўсіх краінах СНД з'яўляецца тое, што заварывалася гэта каша ў нетрах СССР, а расхлёбваць яе кожнай рэспубліцы давядзецца самастойна. Сацыёлагі прапануюць пакет практычных мер па рэгуляванню інтэлектуальнай міграцыі. Ён прадугледжвае, у прыватнасці, пагадненні паміж дзяржавамі — членамі СНД аб захаванні адзінай навукова-інфармацыйнай прасторы, надзвычайную дзяржаўную праграму прамой падтрымкі высокакваліфікаваных навуковых кадраў, навукаёмістых галінаў абарончага комплексу, сур'ёзныя падатковыя і іншыя льготы для навуковых устаноў і вучоных і г. д. Механізм уплыву можа, напрыклад, уключаць арганізацыю навуковых даследванняў на тэрыторыі рэспублік без выезду, але па заказах і на грошы замежных дзяржаўных, грамадскіх і камерцыйных структур. Шлях гэты надзвычай рэальны, бо ў параўнанні з Захадам у нас надта танная працоўная сіла.

Элементам рынaчнага механізму рэгулявання міграцыі можа стаць міжнародная інтэлектуальная біржа. Міжнародны апякунскі савет біржы павінен уключаць як СНДоўскіх, так і заходніх вучоных і прадпрымальнікаў з добрым веданнем міжнароднай кан'юнктуры, а работа біржы — арыентавацца як на патрэбы бізнесу, так і на міжнародныя праграмы ААН, ЮНЕСКА і іншых арганізацый.

Разрыў, які склаўся ў аплаце вучоных у СНД і на Захадзе, настолькі вялікі, што хутка ліквідаваць яго наўрад ці атрымаецца. Размова можа ісці пакуль што толькі аб пэўным апярэджанні аплаты навуковай працы ў адносінах да сярэдняга ўзроўню ў народнай гаспадарцы. Нават калі знойдуцца дадатковыя крыніцы фінансавання (напрыклад, замежныя) усё роўна павысіць аплату працы рэзка, на адзін-два парадкі, не дазволіць грамадская думка.

На жаль, за апошні час вызначылася тэндэнцыя, якая атрымала назву «Канцэпцыя выжывання навукі». Яна, быццам, накіравана на захаванне інтэлектуальнага ядра ў навуковых інстытутах. Але менавіта самыя творчыя спецыялісты не згадзяцца атрымліваць зарплату (якая ўсё роўна значна ніжэй прымальнага ўзроўню) і не мець умоў для паўнацэннай навуковай творчасці. Хутчэй за ўсё «Канцэпцыя выжывання» ў яе сённяшнім разуменні захавае якраз тую частку інтэлігенцыі, для якой невялікая зарплата і вялікі спакой важнейшыя за ўсё. Сапраўдныя творцы ўсё роўна пойдуць, папоўніўшы шэрагі знешніх і ўнутраных інтэлектуальных эмігрантаў.

З гэтага пункту гледжання важней сачыць не за колькасцю вучоных, якія паехалі, а за якасцю тых, хто застаўся, каб навуковыя арганізацыі не ператварыліся ў запаведнікі для безыніцыятыўных людзей. Больш разумна накіроўваць дэфіцытныя рэсурсы не на аплату працы, а на матэрыяльнае забеспячэнне навукі. Немалаважна фінансаванне ўдзелу нашых вучоных у міжнародных канферэнцыях, выстаўках, конкурсах, закупак імпартнага абсталявання і матэрыялаў.

Выжыванне ж беларускай навукі пасля Чарнобыля хавае ў сабе небяспеку: фарміруецца сацыяльная свядомасць, арыентаваная на знешнюю дапамогу, а не на асабістыя сілы. Зразумела, міжнародная дапамога дазволіць вырашыць шэраг вострых паслячарнобыльскіх праблем. Але трэба своечасова ўсвядоміць: Захад — не добры дзядзька, які клапоціцца пра ўсё чалавецтва. Захад — гэта перш за ўсё асобныя краіны і транснацыянальныя карпарацыі са сваімі матэрыяльнымі інтарэсамі.

А ў цэлым пры ацэнцы праблемы «ўцечкі мазгоў» зыходзіць трэба, мабыць, з фармулёўкі, якая змешчана ў дакладзе Рымскага клуба: «Уцечка розумаў з краін, дзе гэтыя людзі могуць прынесці найвялікшую карысць грамадству, у краіны, ужо добра забяспечаныя вопытнымі выкладчыкамі, здольнымі навуковымі і адміністрацыйнымі работнікамі,— гэта страта важнейшых рэсурсаў «чалавечага капіталу», і гэту страту нельга кампенсаваць».

**Генадзь НЕСВЯТАЙЛАЎ,**
**загадчык аддзелам сацыялогіі навукі Інстытута сацыялогіі АН Рэспублікі Беларусь.**

## ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ

***Нашы праблемы носяць часовы характар. Ведаючы, мы маем шанц усё выправіць. Таму, ўнікнуўшы, мы ўбачым відавочнае разыходжанне таго, што бачыць зрок — знешняга — і ўнутранага ў чалавеку. Дуальнасць трэба зняць, каб чалавек пазбавіўся ад пакутлівага стану выбару — і зрабіць гэта чалавек можа сам, свядома.***

# ЧАЛАВЕКА СКЛАДАЮЦЬ ПРАБЛЕМЫ



Чалавека складаюць праблемы, якія ён вырашае — каб развіццё да лепшага не перарвалася. Наяўнасць праблем уласціва свядомасці. У якой сувязі знаходзяцца наша знешняе жыццё і клубок праблем унутры суб'екта: студэнта, прафесара?

Відавочна, што чалавек канцэнтруе вакол сябе толькі пэўныя праблемы, якія адпавядаюць яго характару, яго ўнутранай настроенасці — увогуле ўнутранай сутнасці, ён вылучае з агульнай процьмы праблем нейкія асобныя і не заўважае астаніх.

Гэта — з феноменаў псіхалогіі чалавека. Мы зноў перад дылемай: што ж першаснова ў жыцці — быццё ці свядомасць, і адказ на яго дасць ключ да механіму пазбаўлення ад праблем.

Ці ўладныя мы кіраваць сабой настолькі, каб праблемы нас не прыгняталі? Наогул — ці падуладны нам наш унутраны стан? І тады — што такое «улада рэальнасці»? Яна над тым, хто паддаецца ўладзе? Гэта пытанні ўвогуле. Звернемся да канкрэтнага.

Веданне моладзі ў цэлым — гэта складаная рэч. Бо шматмернасць аднаго чалавека ўводзіла ў зман даследчыкаў, а мы збіраемся весці размову аб усёй моладзі. Кожны з маладых людзей, асабліва з кантыгенту студэнтаў, — гэта настолькі індывідуальнае светабачанне, што ад агульных недакладных высноў лепш засцерагчыся.

Адпак існуюць пэўныя праблемы, з якімі моладзь можа сутыкнуцца, толькі паступіўшы ва ўніверсітэт. Праблемы першакурсніка бываюць чыста псіхалагічныя, а часта яны звязаны з неўладкаванасцю студэнцкага побыту. Да першай катэгорыі можна аднесці праблему ўваходжання ў новы калектыў. Асабістыя юнацкія праблемы абумоўліваюцца станам псіхікі. Як сведчаць лічбы статыстыкі, зарэгістраванай паводле работы «тэлефонаў даверу», колькасць зваротаў моладзі студэнцкага ўзросту складае прыкладна 16 працэнтаў ад усёй колькасці зваротаў. Моладзь ад 18 да 25 гадоў часцей за ўсё непакоіць праблема зносін у маладзёжным асяроддзі. Тут і наладжванне кантактаў, і «пошук партнёра», і іншыя ўнутраныя праблемы.

Часцей патрэбу ў псіхалагічнай дапамозе адчуваюць дзяўчаты (прыблізна 13 працэнтаў зваротаў, і толькі 2,5 працэнта — ад юнакоў).

У пакутлівы працэс перадолення шматлікіх перашкод можна ператварыць звычайнае засяленне ў інтэрнат, а можна прастаяць усе чэргі, бесклапотна размаўляючы з сябрамі наконт апошняй відэапраграмы.

«Сваё пекла ці рай мы выбіраем самі», — казаў калісьці Раджніш. Мы трапім пальцам у неба, спрабуючы вылучаць маладзёжныя праблемы. Бо, шчыра кажучы, праблемай можа быць усё: ад сукенкі да адзнакі на экзамене, і вашы праблемы — гэта ў нечым справа вашага густу. Калі вы перакананыя, калі вы думаеце, ШТО можа быць праблемай — не хвалюйцеся, яно праблемай і стане.

Гэтыя жартачкі датычацца толькі «агульнапрынятых» праблем. Яны назаляюць на паверхні, і хутка выпадаюць з поля зроку. Іх столькі, што працай іх не заўважаць. На іх можна заплюшчыць вочы. Аднак існуе больш глыбінны пласт праблем, якія так проста з галавы не выкінеш. Яны датычацца ўнутранага стану свядомасці. Скажам, праблемы самаразвіцця настолькі недатыкальна блізкія, што іх нельга выцягнуць на паверхню, каб не зрабіць балюча. Усе мы ў пэўныя моманты адчуваем унутры намагчымасць вырашыць нейкае пытанне ў сабе. Там, унутры, мы сам-насам са сваёй праблемай. Здаецца, мы бачым бар'ер, што замінае нам ісці. Гэта вельмі сур'ёзна — праблема жыцця. Вы ведаеце, як баліць парэзаны палец. А калі тую боль памножыць на веліч жыцця — свайго жыцця, свайго лёсу, у якім нешта не складваецца? Грошы, інтэрнат, рэчы — гэта знешняе, павярхоўнае, і наўрад ці можа выбіць вас з каляіны. Яно пройдзе праз пару хвілін — а вось ваша асабістая праблема будзе з вамі да моманту вырашэння. Можа, таму па «тэлефонах даверу» ніколі не пытаюцца, дзе ўзяць грошай — не, гэта, здаецца, не так ужо важна для чалавека. Па дапамогу ідуць з больш сур'ёзным — менавіта са сваёй унутранай праблемай, што стала НЕМАГЧЫМАСЦЮ, якую не разблытаць аднаму. Атрымліваецца, глыбінныя працэсы самаразвіцця азначаюць для асобы значна большае, чым тая мітусня, якую мы звыкла і павярхоўна лічым за праблемы? Разумееце? Мітусню можна абмінуць, але калі вы, разграбаючы смецце, уткнуліся ў нешта жалезнае — вы сустрэлі персанальную праблему, нешта толькі ваша, так непадобнае на ўсе астатнія непаразуменні ў жыцці чалавека.

Менавіта больш глыбокія праблемы маюць значны ўплыў на чалавечае жыццё, на паводзіны і выбар, а ў рэшце рэшт — і на грамадства. Каб ведаць, трэба бачыць углыб, знайшоўшы там трывалыя асновы імклівага на паверхні жыцця.

Н. ЖУК.

## ВІДАВОЧНАЕ- НЕВЕРАГОДНАЕ

# ЗАВАДАТАР БЕЗ ГАЛАВЫ

***Ці не падаюцца вам наступныя параўнанні цікавымі і насцярожваючымі?***

1. Рухаецца касяк селядцоў. Наперадзе — дужы і разумны важак, за ім усе астатнія ў іерархічным парадку. Плывуць, не перашкаджаючы адзін аднаму.

Вас зацікавіць эксперымент этолагаў. Вылаўліваюць з касяка аднаго з радавых селядцоў, зруйноўваюць у яго частку галаўнога мозга. Пасля гэтага селядзец вяртаецца да сваякоў. У выніку аперацыі ён страчвае здольнасць займаць у касяку сваё месца, страчвае пачуццё дыстанцыі. Ён перашкаджае чарадзе плыць у строгім парадку: штурхае суседзяў, натыкаецца на тых, хто плыве ўперадзе, і яны расступаюцца. Нарэшце, апераваная, з пашкоджаным мозгам рыба ўжо наперадзе касяка, становіцца лідэрам. Касяк жа, падпарадкоўваючыся спрадвечнаму інстынкту, пакорліва плыве за новым бязглуздым важаком.

2. У 1923 годзе Адольф Гітлер — важак штурмавікоў арганізаваў у Мюнхене скандал з буйной патасоўкай, вядомы ў гісторыі як «піўны путч». Гітлер быў арыштаваны і паўстаў перад судом. У некаторых з тых, хто чуў істэрычныя бязглуздыя прамовы будучага фюрэра і, магчыма, з тых, хто ведаў яго асабіста узнікла думка-меркаванне, што ён пакутуе на душэўнае захворванне, і таму яго трэба лячыць а не караць.

Для медыцынскага агляду Адольфа Гітлера быў запрошаны псіхіятр прафесар Артур Кронфельд. Пасля кароткатэрміновай размовы з пацыентам прафесар Кронфельд прыйшоў да высновы: Гітлер быў пры свядомасці, павінен быў несці адказнасць за свае ўчынкі; але ж ён — псіхапат, пакутуе на істэрыю з вязкімі паранаідальнымі ідэямі.

Верагодна, гэты эпізод у службовай дзейнасці А. Кронфельда быў ардынарным, і ён не надаваў яму значэння, нягледзячы на тое, што штурмавікі пачалі дасылаць на яго адрас лісты, у якіх пагражалі расправай.

У 1933 годзе Адольф Гітлер прыйшоў да ўлады. Прафесар Кронфельд цвяроза ацаніў бяспеку, якая навісла над ім. Супругі Кронфельд эмігрыравалі ў Савецкі Саюз, дзе прафесар знайшоў палітычнае прытанішча і магчымасць працаваць.

Да вайны жыццё Кронфельда было спакойным. У кастрычніку 1941 года, калі фашысцкія войскі наблізіліся да Масквы Кронфельд і яго жонка прынялі атруту, каб пазбегнуць сустрэчы з былым пацыентам доктара.

3. 1927 год быў цяжкім для Сталіна. Жорсткая барацьба з апазіцыяй, падрыхтоўка планаў калектывізацыі і маштабнага індустрыяльнага будаўніцтва патрабавалі каласальнай нервовай напругі. Тыя, хто многа гадоў ведаў Сталіна, заўважылі, што ў гэтым годзе характар правадыра заўважна змяніўся. Часам Сталін рабіўся зласлівым, выказваў дзўныя ідэі, у якіх праследжваліся нездаровыя адносіны да людзей. Запрасілі урача для кансультацыі.

Гэта быў знакаміты неўрапатолаг акадэмік Бехцераў. Распаўсюджана версія, быццам бы, пагутарыўшы з правадыром, акадэмік у прысутнасці некалькіх чалавек на пытанне аб стане здароўя Сталіна адказаў: «Паранойя».

Вечарам Бехцераў наведаў тэатр, дзе яго па адной версіі частавалі піроўжным, па другой — бутэрбродам з асятрынай, па трэцяй — тортам. Усе версіі сыходзяцца ў адным: пачастунак быў атручаны...

Так трагічна абарвалася жыццё вялікага рускага вучонага-акадэміка Уладзіміра Міхайлавіча Бехцерава.

Ён быў выдатным псіхіятрам, але аказаўся наіўным псіхолагам, за што і паплаціўся жыццём.

## ЯКІЯ МЫ РОЗНЫЯ

# ШТО ВЕДАЕ АСТРАЛОГІЯ...

**Авестыйская школа астралогіі вядома чытачам па многіх публікацыях у газетах. А мы прапануем інтэрв'ю з вучнем школы, студэнтам факультэта журналістыкі, Мікалаем ХІМОРДЗІНЫМ.**

— Загаддзя агаваруся, што буду выказваць сваё асабістае меркаванне, а не меркаванне Авестыйскай школы астралогіі. Я пакуль не спецыяліст, а толькі вучуся на другім курсе (усяго іх пяць).

**— Чаму ж менавіта астралогія?**

— Раней я ўяўляў сабе астралогію як навуку пра рух планет, занятую прадказаннямі чалавечых лёсаў. А прыйшоў у школу і вельмі здзівіўся — гавораць жа больш пра сэнс жыцця, пра адвечную барацьбу дабра са злом і пра тое, як чалавек прымае ў ёй удзел. А планеты і нават зоркі — гэта толькі фон, які стварае адносіны, сілы і падзеі.

**— Так значыць галоўнае ў астралогіі — гэта барацьба дабра са злом?**

— Менавіта так. А само веданне астралогіі толькі дапамагае чалавеку зразумець яго сапраўднае месца ў свеце, яго слабыя і моцныя месцы, дапамагае знайсці светлы шлях у гэтым жыцці, даведацца, на што можна абаперціся з таго, што зроблена ў мінулым.

**— А ці сцвярджае астралогія існаванне Бога?**

— Што за пытанне?! Хто ж тады стварыў гэты свет і нас і хто дапамагае нам у барацьбе супраць зла? У Авестыйскай астралогіі, якая з'яўляецца боскім адкрыццём, Богастваральніка, увасабленне святла і дабра, называюць Ахура-Мазда, а яго ворага-уладара злых сіл — Агра-Манью. Барацьба паміж імі ідзе як у свеце, так і ў кожным чалавеку. Тым больш, што чалавек і ёсць копія Свету, Космасу, Сусвету, у якім мы жывём, і ў нас дзейнічаюць тыя ж законы, што і вакол нас.

Напрыклад, закон адплаты: за дабро — дабро, а за любое зло (нават калі яго ніхто не бачыў) — абавязкова кара. Не ў гэтым жыцці, дык у наступным. Зло — гэта ўсё, што парушае цэласнасць і гармонію створанага Богам свету. Нездарма, у адрозненні ад іншых рэлігій, у астралогіі прызнаецца свяшчэнным не толькі чалавек, але і ўсё, што створана,— вада, зямля, паветра, агонь — свяшчэнныя стыхіі. Гэта, дарэчы, добра ведалі нашы продкі-язычнікі. Яны ставіліся да прыроды як да храма, дзе жыццё — служэнне Богу і Светлым Сілам.

**— А якая можа быць сувязь паміж астралогіяй і нашымі продкамі-славянамі?**

— Самая прамая. Трэба сказаць, што Авестыйская астралогія, хоць і прыйшла да нас з Персіі, але з'яўляецца глыбока «нашай». У нас жа з персамі і індыйцамі агульныя продкі, якія жылі, дарэчы, на тэрыторыі Расіі. Так што патаемныя веды перадаваліся (тысячагоддзямі, як сцвяржжае школа) з пакалення ў пакаленне. Успомніце хаця б волхваў. У Персіі ж гэтыя веды набылі новую форму і ўвасобіліся ў вучэнні першага выратавальніка свету Заратустры. Цяпер яны вяртаюцца на сваю першапачатковую радзіму. Больш падрабязна аб гісторыі і прынцыпах вы можаце прачытаць у інтэрв'ю П. Глобы.

**— Цябе не бянтэжыць той факт, што многія не давяраюць астралогіі?**

— Не. Усё пазнаецца на вопыце. Я б ніколі не павярыў у яе светлую сутнасць, калі б не пераканаўся, што астралогія працуе і гаворыць праўду. Гэта можна праверыць. Астралогія ж — гэта ключ да законаў свету.

**— Значыць, мэта астралогіі — прывесці чалавека да гармоніі са светам?**

— Так, яна прызнае і іншыя шляхі да Святла. Напрыклад, рэлігію: хрысціянства, будызм. Бог адзіны, толькі называем мы яго па-рознаму.

**— Як такія старажытныя веды могуць прыжыцца — жыццё ж цяпер іншае, чым у тыя часы тысячагадовай даўніны?**

— Астралогія дае веды аб жыцці ў адпаведнасці з космасам. Тое, што зараз у нас — гэта не так важна. Галоўнае — перабудаваўшы свядомасць, мы будзем здольныя больш разумна наладзіць сваё жыццё.

**— Якія з духоўных дысцыплін рэкамендуе астралогія для ўнутранага развіцця?**

— У школе прызнаны і прыняты метады, якія вядомы здаўна як памочнікі чалавека ў моманты псіхалагічных крызісаў, у працы над сабой,— гэта медытацыя, ачышчэнне вадой (абмыванне, але з паралельным настроем на ачышчэнне свядомасці ад дурных думак). Духоўная работа праводзіцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі гараскопа, які ўлічвае рытмы Сусвету — зацьменні, становішча планет. Але гэта тонкасці для асобнай гутаркі.

**— Дзякуй. Спадзяемся на працяг.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

10 верасня

Зак. 2191.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.